*Уладзімір Зяневіч*

# АД ФАЛЬКЛАРЫЗМУ ДА ФАЛЬКЛОРУ
## *(асаблівасці і заканамернасці існавання музыкі вуснай традыцыі беларусаў у XXI стагоддзі)*

Тэма народнай традыцыйнай культуры як глыбіннай асновы ўсіх разнастайных кірункаў, відаў і формаў культуры сучаснага грамадства ў век паскоранай глабалізацыі набыла асаблівую вастрыню і актуальнасць. Яна шчыльна злучана з тэмай экалогіі культуры — збераджэння і захавання гістарычнага этнакультурнага асяроддзя, якое ў еўрапейскім рэгіёне аказалася значна пашкоджаным ў выніку глабаліснкай палітыкі мультыкультуралізму [1].

Мэта гэтага артыкула — адзначыць некаторыя асаблівасці і заканамернасці існавання музычнага мастацтва вуснай традыцыі, на якія варта звярнуць увагу сучасным выканаўцам беларускай народнай песні. У дачыненні да традыцыйнай народнай музычнай спадчыны, гаворачы пра неабходнасць яе аховы і інтэграцыі ў сістэме сучаснай духоўнай культуры, маюць на ўвазе шматлікія формы яе збераджэння і захавання. Адной з такіх формаў з'яўляецца захаванне праз перайманне. У сучаснай мастацкай практыцы ў большасці выпадкаў гэты працэс ёсць рух ад фальклору да фальклярызму. Але тых, хто не спыняецца на паўдарозе, шлях вядзе далей: ад фальклярызму да фальклору. Што маецца на ўвазе? Гаворка ідзе пра спецыфічныя асаблівасці і заканамернасці існавання музыкі вуснай традыцыі, пра моўныя сродкі песеннага фальклору, спосабы выраза, жанравыя сістэмы. Фальклор — гэта феномен, які характарызуе традыцыі народаў, і паглыбленне ў эстэтычную сістэму народнага мастацтва — гэта і ёсць засваенне гэтых традыцый.

**Фальклор і фальклярызмы** — гэта з'явы, якія належаць розным тыпам культуры. Іх адрозненні знаходзяцца на ўзроўні культурна-тыпалагічных прыкмет. Фальклор — гэта з'ява традыцыйнай культуры, культуры вуснага тыпу, фальклярызмы — з'ява сучаснай культуры. Калі фальклор — гэта асобная сфера мастацкай дзейнасці, то фальклярызм гэта шматлікія і разнастайныя формы працы з фальклорным матэрыялам, якія адбываюцца ў іншых сферах мастацкай дзейнасці, такіх, напрыклад, як прафесійнае, аматарскае, самадзейнае мастацтвы.

Для добрага разумення сутнасці фальклору як спецыфічнай сферы мастацкай дзейнасці трэба ацаніць і параўнаць мастацкія якасці выканальніцкіх манер як аўтэнтычных народных выканаўцаў, так і тых, каго мы завём пераемнікамі традыцыі. Па вакальных прыёмах, якія ўжываюцца ў традыцыйнай пеўчай культуры, спосабах інтанавання, манеры выканання, фактуры мы адрозніваем сапраўдную народную выканальніцкую культуру ад фальклярызму. Яшчэ адно прыкметнае адрозненне, якое характарызуе фальклярызмы, ляжыць у практыцы апрацоўкі народнага песенна-музычнага матэрыялу. У аснове рэпертуару большасці фальклярыстычных калектываў — аранжыроўкі, у якіх вельмі часта рытмічная, ладавая і гука-вышынная арганізацыі народнай песні парушана.

Прынцыпова важнымі для разумення фальклору з'яўляюцца яго якасці спецыфічна выканальніцкага плана: такія характарыстыкі гукавога поля традыцыі, як тэмбр і артыкуляцыя. Прааналізуем некаторыя мастацкія эталоны народнага традыцыйнага спеву. Сапраўдны фальклор, у адрозненні ад фальклярызму, заўсёды існуе ў пэўным этнаграфічным кантэксце (гаворка, на якой размаўляюць жыхары, гісторыка-культурныя асаблівасці вёскі, формы і спосабы гаспадарання, каляндарныя або сямейныя святы, абрады, рытуалы). У кожным лакальным стылі выпрацоўваецца свой гукавобраз, «гукаідэал», які непасрэдна ўплывае на фарміраванне новага пакалення спевакоў гэтай традыцыі, дзякуючы чаму захоўваецца музычна-выканальніцкая спецыфіка рэгіянальных фальклорных стыляў.

Мова фальклору, сродкі яго выразнасці, мастацкія формы фальклорных тэкстаў непарыўна звязаны з функцыяй, жыццёвым прызначэннем фальклору. Мова фальклору існуе не толькі на эстэтычным узроўні, але, перш за ўсё, на ўзроўні камунікатыўна-інфармацыйным, на ўзроўні знакавых сістэм. І ў гэтым ёсць спецыфіка суадносінаў паэтычнага, музычнага, харэаграфічнага, гульнёвага, абрадава-акцыянальнага і іншых бакоў мастацкай сістэмы фальклору. Як мы адзначылі, фальклор існуе толькі ў сваіх рэгіянальных і лакальных праявах. Кожная лакальная традыцыя мае свае, уласцівыя ёй, тэмбрава-тэсітурныя, артыкуляцыйныя і іншыя выканальніцкія асаблівасці (гукаідэал, па якім захавальнікі традыцыі дыферэнцыруюць сваё і чужое), якія характарызуюць працэс інтанавання і расчыняюцца праз паняцце фальклорнага стылю. Стыль, як слушна заўважыў А. М. Мехняцоў, гэта — «своеасаблівасць тыповага». Фальклорны стыль спазнаецца праз шэраг вызначальных характарыстак фальклорнага тэксту, якія паказваюць на прыналежнасць дадзенага тэксту асобным мясцовым традыцыям, этнакультурным комплексам, гісторыка-культурным пластам, жанравым разнавіднасцям [2].

Найважнейшай характарыстыкай музыкі вуснай традыцыі, па якой мы пазнаем сапраўдны фальклор, з'яўляецца тэмбр. **Тэмбр** ёсць характарыстыка напеву, сэнс і змест твору. З тэмбрам, краскай песні народныя выканаўцы суадносяць тое, што яны вызначаюць як **«голас»** песні. Менавіта гэты голас і абумоўлівае тэмбравыя характарыстыкі напеву. Праз тэмбр передаецца эмацыянальна-вобразная атмасфера песні. Калі гаворым пра тэмбр, маем на ўвазе не індывідуальныя асаблівасці тэмбру канкрэтнага выканаўцы, а «голас» самой песні, адпаведнасць тэмбравых характарыстак песні стылю жанра. І для захавальнікаў традыцыі вельмі важна, каб індывідуальны тэмбр, спецыфічны для кожнага выканаўцы, арганічна спалучаўся з голасам самой песьні. У праявах фальклярызму мы часта назіраем відавочныя неадпаведнасць жаночага, мужчынскага, ці дзіцячага тэмбраў зместу твора, які выконваецца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэмбравыя характарыстыкі гуку шчыльна злучаныя з спосабамі інтанавання. Мелодыя заўсёды афарбаваная, мае тэмбр, і яна заўсёды інтануецца тым ці іншым спосабам. Мы гаворым пра **тэмбраінтанацыю.** І набліжэнне да фальклорнай эстэтыкі патрабуе ад нас спасціжэння заканамернасцяў песенных і не песенных (воклічы, галашэнні, апавядальны тыпы інтанавання) формаў інтанавання, што ў практыцы фальклярызму часта не ўлічваецца.

**Структура фальклорнага ансамбля і фактура спеву.** Агульнае гучанне ансамбля традыцыйных выканаўцаў залежыць ад майстэрства дзвюх галоўных чальцоў народнага ансамбля — запявалы і падгалоска (падводкі). У традыцыйным ансамблі гэта спевакі, якія вызначаюцца яркім самабытным талентам, высокамастацкім вакальным майстэрствам, заснаваным на глыбінным веданні традыцыі, прыродным дарункам імправізатара.

**Традыцыйныя прыёмы** народнага вакалу, эстэтыка гуку. Сапраўднае народнае выкананне, як правіла, вызначае гучная манера вакалізацыі, сакавітасць, маляўнічасць тэмбраў, напружаная тэсітура, прыпадняты тонус, радасная эмацыйнасць выканання. Яшчэ адна рыса —асаблівая «**кантыленнасць»,** якая дасягаецца агаласоўкай зычных, драбненнем і дынамізацыяй доўгіх гукаў, што ўтварае адчуванне працяжнасці гучання. Гэта добра бачна, калі мы аналізуем графіку падрабязных аналітычных натацый запісаў, зробленых у мінулым стагоддзі: у запісах расшыфровак, практычна адсутнічаюць буйныя працягласці, так званыя доўгія ноты, і, насупраць, мільгае багацце дробных рытмічных пабудоў, разнастайных мелізмаў, фаршлагаў, пад'ездаў, скідаў, кіксаў, глісандуючых інтэрвальных звязкаў, паўзаў. Усе пералічаная накіраваны вылучна да адной мэты – развіцця гуку як такога. Фаршлагі да ноты зверху, пад'езды, скіды, выконваюць функцыю аптымізацыі працэсу гукападачы. Кожная нота з фаршлагам становіцца больш магутнай, яркай, маркацыраванай. Гэта і дае тое інтэнсіўнае фальклорнае гучанне, якое захапляе нас у выкананні сапраўдных майстроў народнага мастацтва.

**Паўзы і словаабрывы.** У народнай выканальніцкай практыцы паўзы і словаабрывы выконваюць важную функцыю аптымізацыі працэсу гукападачы, адыгрываюць ролю своеасаблівага імпульсу да спараджэння наступнага гуку. Яшчэ адзін з найболей характэрных, часта ўжытных сродкаў мастацкай выразнасці ў традыцыйным выканальніцтве — **запаўненне «меладычнай прасторы»** паміж ладавымі апорамі. Калі слухач здольны ўчуць, то ён заўважыць, што ў народным выкананні не часта сустракаюцца «пустыя» незапоўненыя меладычныя рухі на вялікія інтэрвалы; апоры заўсёды злучаныя секундай, якая праходзіць, ці іншым, больш дробным інтэрвалам, ці глісанда. Меладычная прастора ў фальклоры існуе нават паміж самымі дробнымі інтэрваламі і яна, як правіла, таксама запоўненая. Важны і ўпадабаны ў народнай практыцы прыём — **агаласоўка** буйных працягласцяў, якая ўяўляе сабой наўмыснае драбненне народнымі выканаўцамі буйных працягласцяў на драбнейшыя. Як правіла, у працэсе такога драбнення склад паэтычнага тэксту разбіваецца на розныя галосныя літары. У выніку гэтага прыёму кожны гук, які дробніцца, атрымоўвае моцны дадатковы імпульс да працягу гучання, да свайго падаўжэння, ён «жыве», па вызначэнні саміх захавальнікаў традыцыі. Гэтым прыёмам забяспечваецца кантылена і дыкцыя. **Працяглы гук** — яшчэ адна рыса манеры народнага выканання. Прыём напаўнення кожнай працягласці драбнейшымі працягласцямі. (У кожнай палавіннай выразна чутныя дзве чвэрці, у сваю чаргу ў чвэрцях — па дзве восьмыя і гэтак далей). Такое напаўненне гуку знутры таксама не дае страціцца эфекту вылучнай кантылены.

**Характар гучання** сапраўднага народнага ансамбля, мае свае індывідуальныя асаблівасці, па якіх мы лёгка вызначаем, што гэта, да прыкладу, Усходняе Палессе ці, больш дэталёва вёскі Неглюбка, Янова, або знакамітыя вёскі Клятная, Тонеж, або Спорава ў Заходнім Палессі. У выпадку Усходняга Палесся гэта надзвычай яркае, сакавітае, палётнае «імпрэсіяністычнае» гучанне ў высокім рэгістры, «насорнае», якое часам захоплівае другую актаву. І наадварот, — гучанне ансамбляў з Заходняга Палесся характарызуе суровае, мясістае грудное рэзанаванне жаночых галасоў, напружанае гучанне мужчынскіх у высокай тэсітуры, што надае адмысловыя фарбы агульнаму вакальнаму стылю гэтай лакальнай традыцыі. Характар гучанне вельмі важная характарыстыка народнай выканальніцкай традыціі, якая накладвае адмысловы адбітак на спосабы развіцця мелодыі, манеру імправізацыі, рэалізацыю шматгалоснай фактуры ў цэлым.

З улікам шматгадовага досведу практычнай фальклярыстыкі і этнамастацкай адукацыі Беларусі ў XXI стагоддзі відавочна, што без непасрэднага далучэння да сапраўднай народнай творчасці, без вызначанай ступені пагружанасці ў фальклорную стыхію засваенне і перайманне традыцыйнага мастацтва немагчымае. Разуменне прыроды фальклору як адмысловага тыпу культуры, уваходжанне ў яго эстэтычную сістэму, вызначэнне і адзнака месца і значэння народнай музыкі ў сучасным свеце ёсць важнай ўмовай на шляху ад фальклярызму да фальклору.

**Спіс літаратуры:**


1. Конан, У. Аўтэнтычная народная культура ва ўмовах глабалізацыі / У. Конан // Беларусь- XXI стагоддзе: нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. «Міжкультурны дыялог у Беларусі : нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё ва ўмовах глабалізацыі», Мінск, 10-12 сн. 2003 г. — Мінск : ННФЦ Ф. Скарыны, 2004. — С. 90–97.
2. Мехнецов, А.М. Стиль в музыкальном фольклоре (замечания к постановке проблемы) / А.М. Мехнецов // Фольклор: современность и традиция : материалы Ш междунар. конф., памяти А.В. Рудневой / Московская консерватория. – М., 2004. — С. 40–44.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ